Республики Беларусь и Российской Федерации в области образования явилось совместное постановление заседаний двух коллегий Министерств образования, состоявшееся в Могилеве 19 января 2001 г., о создании «Союзного научно-образовательного центра — Университета интеграции». Он должен объединить ведущие учебные заведения двух стран, у которого будет общее административное управление. По замыслу авторов данного проекта, Университет интеграции должен стать разработчиком основных образовательных программ и стандартов, опираясь при этом на достижения стран в данной области с учетом мирового опыта.

## ГАЛОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ВАЙСКОВАГА ЗАКАНАДАЎСТВА ВКЛ У XVI ст.

*Каляда В. В., Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Вайсковае права было адной з найбольш важкіх галінаў дзяржаўнага права Вялікага княства Літоўскага. Пад дадзеным тэрмінам мы разумеем сукупнасць прававых нормаў, якія рэгулявалі ўнутранае жыццё, побыт, арганізацыю і дзейнасць войска. Вайсковае права таксама вызначала прынцыпы і формы існавання войска, парадак мабілізацыі і адбывання вайсковай павіннасці, правы і абавязкі вайскоўцаў, усталеўвала адказнасць за парушэнне вайсковай дысцыпліны і ўчыненне воінскіх злачынстваў. Вайсковае права ВКЛ, як і сучаснае вайсковае права Рэспублікі Беларусь, з'яўлялася комплекснай галіной права, паколькі ўключала ў сябе нормы як традыцыйных галінаў права (цывільнага, крымінальнага і інш.), гэтак і нормы спецыфічных вайскова-прававых актаў: артыкулаў вайсковых, «лістоў ваенных», загадаў і «навукаў» вялікага князя, гетманскіх універсалаў і г. д.

Развіццё вайсковага заканадаўства ВКЛ у XVI ст. можна падзяліць на два галоўных этапы: дастатутны і статутны. Пачаткам дастатутнага перыяду можна лічыць выданне спецыяльнай пастановы, прынятай на Навагрудскім сойме 1502 г. У хуткім часе былі прыняты іншыя акты вайсковага заканадаўства. У 1507 г. былі выдадзеныя Віленскія і Менская ваенныя ўставы, якія былі прысвечаны разнастайным пытанням, звязаным з абаронай дзяржавы і функцыянаваннем войска. У наступны перыяд былі выдадзеныя ўставы 1508, 1511, 1514, 1522, 1528 гг. і інш. Законы былі прысвечаны розным пытанням арганізацыі і дзейнасці Паспалітага Рушэння і найманых атрадаў войска ВКЛ. У іх вызначалася кампетэнцыя гетмана, парадак мабілізацыі апаўчэнцаў, адказнасць вайскоўцаў за ўчыненыя воінскія злачынствы і г.д. Усе ўставы былі выдадзены на старабеларускай мове. Крыніцаю дадзеных прававых нормаў было пераважна звычаевае права, аднак, не выключаны і пэўны ўплыў польскага і права іншых еўрапейскіх краінаў.

Пачатак статутнага перыяду звязаны з прыняццем Статута 1529 г., у якім, былі сканцэтраваны ў 15 артыкулах другога раздзелу («Аб абароне земскай») асноўныя палажэнні, адносна арганізацыі і дзейнасці Паспал-

ітага Рушэння і іншыя нормы вайсковага права. Фундаментам для вайскова-прававых нормаў Першага Статута паслужылі пераважна нормы дастатутнага перыяду і звычаевае права. У далейшым палажэнні Статута 1529 г. былі ўдакладнены пастановамі сойму і рэальнай практыкай. У 1566 г. быў прыняты новы Статут, які таксама ўтрымліваў раздзел «Аб абароне земскай». Хаця, генетычна нормы Статута былі звязаны з нормамі Статута 1529 г., па аб'ему прававога рэгулявання і ўзроўню юрыдычнай тэхнікі, новы закон 1566 г., значна пераўзыходзіў папярэдні. Заканадаўцай былі ўлічаны недахопы і прабелы ў прававым рэгуляванні, якія выявіліся пад час дзеяння Статута 1529 г., палажэнні соймавых ухвалаў, напрыклад, пастановы сойму 1563 г. і інш. Некаторыя нормы Статута 1529 г. былі дапоўнены, альбо перапрацаваны з улікам рэальнай практыкі і палітычных абставін. Шэраг нормаў, як, напрыклад, артыкулы прысвечаныя асобным пытанням дзейнасці найманых атрадаў, з'явіліся ў Статуце ўпершыню. Усяго ў другім раздзеле Статута 1566 г. было 29 артыкулаў. Раздзел жа "Аб абароне земскай" трэцяга Статута 1588 г. у асноўным паўтараў палажэнні папярэдняга закону, таму ўнесеныя змены не мелі вялікага значэння і ў цэлым не змянялі канцэпцыі Статута 1566 г.

Паралельна са статутным вайсковым заканадаўствам, развіваецца практыка выдання артыкулаў вайсковых — спецыяльных актаў вайсковага заканадаўства, якія былі прысвечаны пытанням ўнутранага жыцця, побыту і дзейнасці войска, тактыкі бою і ўсталеўвалі правы і абавязкі вайскоўцаў пад час адбывання вайсковай службы, парадак іх узаемадачынення з цывільным насельніцтвам і г. д. Развіцце артыкулаў вайсковых было абумоўлена тым, што корпус статутнага вайсковага права, быў галоўным чынам прысвечаны пытанням арганізацыі і дзейнасці феадальнага апаўчэння — Паспалітага Рушэння. У той жа час з пашырэннем выкарыстання наемных войскаў, удасканаленнем баявой тактыкі і тэхнікі, а таксама ў сувязі з агульным развіццем войска і сістэмы кіравання ім патрабавалася нарматыўнае рэгуляванне гэтых працэсаў.

У XVI ст. з'яўляецца цэлы шэраг артыкулаў вайсковых. Так, у 1535 г. былі выдадзеныя на старабеларускай мове «Артыкулы вайсковыя вялікага князя Жыгімонта I для Літвы»,. Пазней з'яўляюцца — «Артыкулы для ротмістраў на замку ў Пернаве» ад 2 траўня 1562 г., гетмана дворнага Рыгора Хадкевіча, "Артыкулы вайсковыя Яна Хадкевіча старасты жмудскага для войска на лежах, выдадзеныя пад Улай у 1564 г. У 1566 г. былі выдадзеныя артыкулы вайсковыя Рыгора Хадкевіча, ужо гетмана вялікага літоўскага. У 1581 г. пад час вайсковай выправы былі выдадзеныя артыкулы вайсковыя ад 10 жніўня 1581 г. Стэфана Баторыя. Асобна патрэбна адзначыць артыкулы, якія тычыліся выключна артылерыі. Так, пытанням вайсковай службы менавіта артылерыстаў былі прысвечаны Артыкулы пушкарскія 1557 і 1567 гг.

Такім чынам, у XVI ст. у ВКЛ назіраецца актыўны працэс развіцця вайсковага права, вынікам якога было ўлучэнне ў статутны корпус права асобнага раздзелу «Аб абароне земскай», які галоўным чынам быў прысвечаны пытанням арганізацыі і дзейнасці Паспалітага Рушэння. Галоў-

най крыніцай вайсковага права Статута 1529 г. былі нормы дастатутнага перыяду. Генетычную сувязь і пераемства з правам дастатутнага перыяду і нормамі Статута 1529 г. захавалі і раздзелы «Аб абароне земскай» Статутаў 1566 і 1588 гг., хаця апошнія былі больш дасканалымі, бо адлюстроўвалі асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця ВКЛ у другой палове XVI ст. Развіцце артыкулаў вайсковых было абумоўлена неабходнасцю ліквідацыі прававых прабелаў у сферы арганізацыі і дзейнасці войска. Трэба адзначыць, што дадзены працэс адбываўся ў кантэксце агульнаеўрапейскіх тэндэнцый развіцця вайсковага права.

## ПРИОРИТЕТЫ ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКИ ВЕЛИКОБРИТАНИИ

*Кукреш Т. Г., Белорусский государственный университет*

Одним из центральных органов, представляющим интересы Великобритании на мировой арене, является *Foreign Office*(Министерство иностранных дел Соединенного Королевства Великобритании и Северной Ирландии) . К основным задачам *Foreign Office* относят осуществление защиты и продвижение интересов Британии за рубежом, консультирование и содействие в формировании внешней политики Великобритании.

Международные приоритеты Соединенного Королевства на ближайшие 10 лет были впервые опубликованы в декабре 2003 г., в так называемой Белой книге или Стратегии развития. Данный документ был разработан Foreign Office и утвержден парламентом. *Foreign Office* принял на себя обязательство корректировать внешнеполитический курс страны каждые два года с целью его соответствия международной обстановке. Развитие событий в последующие два года доказало, что принятый в 2003 г. внешнеполитический курс соответствует духу времени.

В Белой книге 2003 г. *Foreign Office* выделял 8 главных приоритетов внешней политики Великобритании: 1) защита мира от глобального терроризма и оружия массового поражения; 2) защита Соединенного Королевства от незаконной миграции, наркотрафика и международной преступности; 3) создание международной правовой системы разрешения и предотвращения конфликтов; 4) эффективно действующий ЕС в безопасном окружении; 5) содействие британским экономическим интересам в условиях открытой мировой экономики; 6) устойчивое развитие, основанное на демократии, эффективном управлении и соблюдении прав человека; 7) безопасность британских и мировых энергетических запасов; 8) безопасность и эффективное управление британскими заморскими территориями.

Принимая во внимание: 1) возрастающую энергетическую уязвимость страны, 2) необходимость выработки новых стратегий предотвращения незаконной иммиграции, 3) потребность в высококвалифицированных консульских услугах, в марте 2006 г. Белая книга была обновлена и определила новые стратегические международные приоритеты, опираясь на документ 2003 г.